ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983

9 ЧЭРВЕНЯ ЧАЦВЕР

№ 22 (1398)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ ПРЫЗ

Літаратурнага музея Якуба Коласа атрымала студэнтка 4-га курса хімічнага факультэта Алена Гайдучонак за мастацкае чытанне твораў Якуба Коласа на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе, прысвечаным стагоддзю з дня нараджэння песняра.

У. МАКАРЭВІЧ,
дырэктар студэнцкага клуба.

У ДРУГІ РАЗ

па просьбе студэнтаў сумесна з Беларускім аддзяленнем Усесаюзнага бюро прапаганды кінамастацтва студэнцкі клуб арганізаваў вечар кіно «Героі і «антыгероі» Алена Дэлона і Жана Поля Бельмандо», на якім выступіла кіназнаўца І. Рубанава. Былі прадэманстраваны фрагменты з кінастужак «Чорны цюльпан», «Паўторны шлюб» і мастацкі фільм «Хто ёсць хто».

Н. АЛЕГАВА.

НА РАЁННЫМ ЗЛЁЦЕ

ўдзельнікаў Усесаюзнага паходу моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа каманда універсітэта заняла першае месца.

Каманда была першай і ў асобных конкурсах: на лепшую арганізацыю аперацыі «Летапіс Вялікай Айчыннай» і лепшую арганізацыю паходаў па месцах славы савецкага народа.

А. НЕЖАВЕЦ,
намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

АДБЫЛАСЯ СУСТРЭЧА

членаў камітэта камсамола з прадстаўнікамі зямляцтваў арабскіх студэнтаў і аспірантаў, што вучацца ва універсітэце. Яна прысвячалася Міжнароднаму дню салідарнасці з арабскімі народамі. У ходзе гутаркі былі падведзены вынікі і вызначаны перспектывы далейшай сумеснай дзейнасці камсамольскай арганізацыі універсітэта, саюзаў моладзі і зямляцтваў арабскіх навучэнцаў, адзначаны важнасць і неабходнасць больш цесных кантактаў паміж імі.

В. АРЛОЎ,
інструктар камітэта камсамола універсітэта.

● КАНФЕРЭНЦЫЯ

«РУСКІ Б Я ВЫВУЧЫЎ...»

РУСКАЯ МОВА як замежная пачала выкладацца ў ВНУ Беларусі з 1961 года, калі ў наш універсітэт на падрыхтоўчы факультэт прыехала першая група замежных навучэнцаў — пасланцоў Востава Свабоды.

Больш як 10 гадоў існуе кафедра, якая ажыццяўляе выкладанне рускай мовы замежным студэнтам, аспірантам і стажорам, што вучацца на асноўных факультэтах універсітэта: фізічным, хімічным, біялагічным, механіка-матэматычным, гістарычным, філалагічным, факультэце прыкладной матэматыкі і інш.

Выкладчыкі кафедры праводзяць вялікую вучэбную, навукова-метадычную і выхаваўчую работу з замежнымі навучэнцамі больш чым з 60 краін свету.

Штогод, пачынаючы з 1977 года, на базе кафедры праводзяцца рэспубліканскія навукова-метадычныя канферэнцыі, прысвечаныя розным праблемам выкладання рускай мовы як замежнай. Не быў выключэннем і сёлетні год. Нядаўна ў зале пасяджэнняў вучонага савета універсітэта праходзіла рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Тэхнічныя і аўдыёвізуальныя сродкі ў навучанні рускай мове замежных студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей», у якой прынялі ўдзел вядучыя спецыялісты Інстытута рускай мовы імя А. С. Пушкіна (г. Масква), ВНУ Мінска, Ерэвана, Кіева, Ленінграда, Адэсы, Крывога Рога, Горак, Віцебска. Удзельнікі канферэнцыі праслухалі каля 60 дакладаў па тэме канферэнцыі, пазнаёміліся з вучэбнымі кіна- і слайд-фільмамі, падрыхтаванымі сектарам тэхнічных і аўдыёвізуальных сродкаў навучання Інстытута рускай мовы імя А. С. Пушкіна.

Назапашаны членамі кафедры вопыт выкладання рускай мовы як замежнай знаходзіць сваё адлюстраванне і ў навуковых публікацыях. За апошнія гады выкладчыкамі кафедры апублікаваны шэраг навуковых артыкулаў, вучэбна-метадычных зборнікаў і дапаможнікаў, падрыхтаваны навукова-метадычныя распрацоўкі з выкарыстаннем тэхнічных і аўдыёвізуальных сродкаў навучання, створаны вучэбны комплекс па рускай мове для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей Індыі.

У. БУДАЙ,
кіраўнік інтэрпрэс-цэнтра.

НА ЗДЫМКАХ: у час работы канферэнцыі.

Фота **В. Шачака.**



НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

Слова пра настаўніка

ПРАФЕСАРУ кафедры рускай класічнай літаратуры Фёдару Іванавічу Куляшову спаўняецца 70 гадоў з дня нараджэння і 50 гадоў працоўнай дзейнасці, з якіх звыш 30 прыпадае на БДУ імя У. І. Леніна.

За час работы ва універсітэце Фёдар Іванавіч падрыхтаваў дзесяткі тысяч школьных настаўнікаў і сотні выкладчыкаў для вышэйшых навучальных устаноў. Куляшоў назаўсёды пакарыў нас, сваіх выхаванцаў, дысцыплінаванасцю думкі, лектарскім талентам, сваёй прынцыповасцю і аб'ектыўнасцю. Мне пашчасціла быць адным з першых яго вучняў. Настаўнікам для мяне ён застаўся на ўсё жыццё. Нас, вучняў Фёдара Іванавіча, вельмі шмат нават ва універсітэце, асабліва калі ўлічыць былых аспірантаў і дактарантаў. Чытаў ён у нас большасць курсаў, пачынаючы з гісторыі і тэорыі літаратуры, крытыкі і журналістыкі да дзіцячай літаратуры ўключна.

Прафесар Куляшоў стварыў цэлую школу русістаў для нашай рэспублікі і для братніх рэспублік нашай вялікай краіны. Ён выдаў шмат манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, напісаў і апублікаваў сотні навуковых артыкулаў і рэцэнзій па рускай і па беларускай літаратуры. Дарэчы, друкавацца Фёдар Іванавіч пачаў у 1932 г. Ён — член Саюза пісьменнікаў. Сярод яго прац заслугоўваюць быць спецыяльна адзначанымі «Міхась Лынькоў» (1963), «Творчы шлях А. І. Купрына» (1968), «Іван Мележ» (1968), «Л. М. Талстой» (1969), «Курс лекцый па гісторыі рускай літаратуры канца XIX — пачатку XX стагоддзяў» у дзвюх частках (першая выйшла ў выдавецтве БДУ ў 1976 годзе, другая — у 1980).

Фёдар Іванавіч Куляшоў — жывая энцыклапедыя, да якой нярэдка звяртаюцца вучоныя многіх краін свету. І гэта вялікае шчасце для ўсіх нас, што ён жыве разам з намі і разам з намі працуе ў Белдзяржуніверсітэце.

Калі паспрабаваць акінуць вокам усё, зробленае Фёдарам Іванавічам да свайго сямідзесяцігоддзя (справа нялёгкая, але магчымая), дык перад намі паўстане, па-першае, шырокі малюнак паслядоўнага і рознабаковага развіцця рускага рэалізму на яго апошнім, перадкастрычніцкім этапе. Этап гэты надзіва складаны і даволі супярэчлівы, як і сама руская літаратура тых часоў. Разнастайныя плыні і напрамкі спрыялі гэтаму. Аднак магістральным шляхам класічнай рускай літаратуры заўсёды быў і застаўся рэалізм, успрыняты буйнейшымі мастакамі слова ад папярэдніх эпох, ад самога жыцця і бліскуча развіты ў новых, сацыялістычных умовах.

Па-другое, таленавіта расказаўшы пра творчасць М. Горкага, І. Буніна, А. Купрына, Л. Андрэева, В. Брусава, А. Блока, А. Талстога і маладога Ул. Маякоўскага, а таксама пра выдатных беларускіх празаікаў М. Лынькова, І. Шамякіна, І. Мележа, Я. Брыля, І. Навуменку і многіх іншых, Куляшоў падводзіць савецкага і замежнага чытача да правільнага, беспамылковага ўспрыняцця рускай і беларускай савецкай літаратуры.

У сваіх выдатных лекцыях і ў навуковых працах Ф. І. Куляшоў шырока выкарыстоўвае дзённікі, прыватную перапіску, мемуары, запісныя кніжкі, раннія творы і іншыя крыніцы, якія адкрываюць перад чытачом творчую лабараторыю кожнага майстра слова. І мы быццам самі прысутнічаем пры нараджэнні кожнага новага таленту. А тым часам перад намі паўстае жывы пісьменнік з усімі яго асаблівасцямі ў адметных канкрэтна-гістарычных умовах яго фарміравання і развіцця.

Кнігі і навуковыя артыкулы Ф. І. Куляшова, уся яго навукова-педагагічная і грамадская дзейнасць робяць найлепшае ўражанне і выклікаюць шчырую павагу да яго, як настаўніка і вучонага, крытыка і публіцыста.

Л. ВАНКОВІЧ,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт.

ДАЁШ НА ВЫДАТНА

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

ЗВОДНАГА СТУДЭНЦКАГА АТРАДА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА НА РАБОЧЫ ПЕРЫЯД 1983 ГОДА

Мы, байцы зводнага студэнцкага атрада Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, ідучы насустрач 65-годдзю ўтварэння Ленінскага камсамола, прымаем на сябе наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

1. Працуючы пад дэвізам «XI пяцігодцы — ударную працу, веды, ініцыятыву і творчасць маладых!», важнейшай задачай зводнага студэнцкага атрада лічыць якаснае выкананне вытворчых заданняў, актыўную грамадска-палітычную дзейнасць.

2. Ударнай справай зводнага студэнцкага атрада лічыць ваенна-патрыятычную работу.

3. Змагацца за прысваенне зводнаму студэнцкаму атраду Белдзяржуніверсітэта імя Ленінскага камсамола Беларусі.

4. Асвоіць не менш як 4,5 млн. рублёў капіталаўкладанняў.

5. Падаць не менш 20 рацпрапаноў з эканамічным эфектам не менш як 30 тыс. рублёў.

6. Здаць 15 аб'ектаў са студэнцкім знакам якасці.

7. Укараняць у жыццё прагрэсіўныя метады выканання работ. Пятнаццаці студэнцкім атрадам перайсці на работу па метаду брыгаднага падраду.

8. Будаўнічым атрадам працаваць па асабовых рахунках эканоміі і якасці. Ліквідаваць выпадкі парушэння ТБ, вытворчага траўматызму.

9. Прачытаць на будаўнічых пляцоўках, палявых станах, у школах, сельскіх клубах 1500 лекцый.

10. Агітацыйным брыгадам СБА даць 800 канцэртаў.

11. Аказаць дапамогу ў рамонце і афармленні не менш чым 30 сельскіх школ.

12. Удзельнічаючы ў рэалізацыі Харчовай праграмы, кожнаму атраду правесці не менш як 2 суботнікі на аб'ектах сельскай гаспадаркі, на нарыхтоўцы кармоў, на ўборцы ўраджаю.

13. У кожным атрадзе арганізаваць кансультацыйныя пункты для паступаючых у ВНУ. Арганізаваць лагеры-спадарожнікі.

14. Дабіцца, каб студэнцкія атрады сталі сапраўднай школай выхавання ў байцоў савецкага патрыятызму, пралетарскага інтэрнацыяналізму, калектывізму, сяброўства, высокіх маральных якасцей.

ПРАШУ СЛОВА

«Працяг біяграфіі»

БУДАЎНІЧЫЯ ПЛЯЦОЎКІ Мінска, палеткі Віцебшчыны, сонечная Малдавія — вось працоўная геаграфія студэнцкага будаўнічага атрада «Верасок». У гэтым годзе мы будзем працаваць на кансервавым заводзе «Кастрычнік». Прадпрыемства перапрацоўвае прадукцыю з палёў і садоў усяго Слабадзейскага раёна. Так што лета будзе «гарачае». І як будзе працаваць на малдаўскай зямлі наш атрад, у многім залежыць ад падрыхтоўчага перыяду.

Перыяд гэты быў напружаны. Вучоба па тэхніцы бяспекі, медыцынскі агляд, суботнікі, работа лектарскай групы, выступленні агітбрыгад — вось далёка не поўны пералік спраў за гэты час. Пад кіраўніцтвам К. Крукоўскай добра працавала група «Пошук», якая займалася летапісам «Вераска». Дзякуючы пошукаўцам мы даведаліся, што першым камандзірам атрада была Ася Надольская, якая зараз працуе ў Мядзельскім райкоме партыі. Камісарам «Вераска» 1973 і 1974 гадоў быў цяперашні камісар рэспубліканскага штаба СБА М. Ціцянкоў. Мы даведаліся, што ў 1973 годзе байцы атрада працавалі ў мікрараёне «Зялёны Луг» на будаўніцтве магазіна, які названы ў гонар атрада — «Верас».

Пад кіраўніцтвам Ірыны Папурэнка была падрыхтавана цікавая праграма агітбрыгады, прысвечаная подзвігу ганаровага байца атрада камсамолкі Надзеі Курчанка. Нямала давялося папрацаваць над зборам матэрыялаў для сцэнарыя. Напрыклад, ўдзельнікі агітбрыгады І. Азарэнка, С. Пяткун сустракаліся з урачом, якая была разам з Курчанка ў самалёце ў час яе апошняга рэйсу.

Байцы «Вераска» — звычайныя студэнты. І ў падрыхтоўчы перыяд галоўнае для нас — вучоба. Хочацца сказаць, што ў саставе нашага атрада 11 выдатнікаў вучобы, 30 байцоў вучацца на выдатна і добра. Зараз падрыхтоўка да трэцяга працоўнага ўжо закончана. Наперадзе не менш важны экзамен — працоўны.

А. ХВАЙНІЦКАЯ,
камандзір СБА «Верасок».

ПРАШУ СЛОВА

«Наша пуцяводная зорка»

«СТЭЛУЦА» багатая сваімі традыцыямі. На яе рахунку шмат добрых спраў. У мінулым годзе атрад стаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод лінейных атрадаў Стаўрапольскага краю.

Зараз «Стэлуца» рыхтуецца да новага працоўнага семестра — своеасаблівага экзамена на мужнасць і вынослівасць, вернасць і дружбу.

Ці падрыхтаваны мы да гэтага выпрабавання? Вынікі работы «Стэлуцы» ў падрыхтоўчы перыяд даюць станоўчы адказ. Мы бліжэй пазнаёміліся, знайшлі новых сяброў, адчулі дух атрада. І тут нельга не адзначыць нашых байцоў «са стажам»: Л. Арцёмчык, Г. Гардзінскую, А. Францкевіч, А. Шаблоўскую, Л. Сідадэнка, М. Ратнікаву і іншых.

Радуе ў гэтым годзе наша папаўненне. Хочацца назваць самых актыўных навічкоў. Гэта І. Пыхціна, І. Тарасевіч, Г. Шкор, І. Кулік, І. Вернігор, М. Макарэвіч, З. Зайцава.

Па выніках работы ў падрыхтоўчы перыяд «Стэлуца» заняла першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве сярод лінейных атрадаў мехмата.

Але спыняцца на дасягнутым нельга. Наперадзе шмат новых задач. І ніякія цяжкасці не здольны перамагчы наш аптымізм. Мы зноў і зноў змяняем утульнасць гарадскіх кватэр на рамантыку будатрадаўскага лета. «Стэлуца» стала для ўсіх, хто хоць раз пабываў у ёй, часткай жыцця, нашай пуцяводнай зоркай.

А. ДУЛІНЕЦ,
камандзір СБА «Стэлуца».

ЗНАЁМЦЕСЯ, КАЛІ ЛАСКА!

КАЛІ ЎСЁ ЎПЕРШЫНЮ

ТАЦЦЯНА ПРЫЙШЛА ў рэдакцыю, як дамовіліся, мінута ў мінуту. Нават гаварлівае радыё спынілася на хвіліну, каб задаволеным «піканнем» пацвердзіць: так, так, роўна дзесяць гадзін раніцы. Першае пытанне задаваць не спатрэбілася, і так было зразумела, што адметнай рысай камісара СБА Таццяна лічыць адказнасць. Іменна гэта якасць характару дапамагае ёй не разгубіцца ад мноства спраў, якія, дарэчы, даводзіцца выконваць упершыню.

Тое, што будзе няпроста, ведалі, бадай, усе. Нехта прыкідваў: ці варта ствараць атрад з першакурснікаў, якія жыцця, як кажуць, не бачылі, працаваць па-сапраўднаму не навучыліся? Нехта прытрымліваўся тактыкі чакання, маўляў, пажывём — убачым. А энтузіясты рашылі дзейнічаць.

Пад ляжачы камень вада не цячэ. І калі б не камсорг 12-й групы Галя Сняжко, мары аб будатрадзе ніколі б не сталі рэальнасцю. Арганізоўвала, дабівалася, пераконвала. У выніку і тыя, хто сумняваўся, і тыя, што прыглядаліся, пацягнуліся ў «Брыганціну», а конкурс у атрад «падскочыў» разы ў два. Зразумелі людзі — не проста «гутаркі на тэму» вядуцца, пачынаецца сапраўдная справа.

Іменна так — пачынаецца. І пакуль што нядрэнна. Падрыхтоўчы перыяд прайшоў, што называецца, на выдатна. Канешне, можна гэта растлумачыць і так — усё, што робіцца ўпершыню, уяўляецца цікавым, адсюль — энтузіязм, жаданне дзейнічаць... Тлумачэнне гэтае ўвогуле справядлівае, але не зусім дакладнае. Не толькі «момант навізны» адыграў тут сваю станоўчую ролю. Арганізацыя справы — вось у чым сакрэт. Разгадка яго ўявіцца, хутчэй за ўсё, занадта звычайнай: у перадпрацоўным жыцці «Брыганціны» прымаў удзел кожны баец.

Можна было б расказаць, як складалі студэнты вершы для афармлення кутка па тэхніцы бяспекі, як праводзілі сход, прысвечаны ганароваму байцу атрада Юрыю Гагарыну, як працавалі на суботніках. Аднак прадбачу пытанне: за якія ж заслугі не выпрабаваны яшчэ нялёгкай справай атрад рэкламуе прэса? Згаджаюся, няма пакуль што ніякіх заслуг. Але атрад ёсць, і, мяркуючы па старту, добры атрад. Таму і спадзяюся, што, насуперак вядомай прыказцы, «першы блін» выйдзе ў «Брыганціны» на славу. А каб супакоіць скептыкаў, абавязуюся ў канцы трэцяга працоўнага вярнуцца да жыцця і працы атрада, каб расказаць пра яго чытачам больш падрабязна.

Н. КАЛІШЭВІЧ.

ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ!

ПРАШУ СЛОВА

«Квітней, Калевала»

УЗРОСТ СТУДЭНЦКАГА будаўнічага атрада імя С. П. Каралёва, што фарміруецца на фізічным факультэце, — шэсць гадоў. Месца прапіскі — Карэльская АССР. Апошнія гады атрад дыслакаваўся ў пасёлку Калевала.

Сёння мы ўпэўнены, што мясцовае насельніцтва і кіраўніцтва ўспамінаюць нас, як кажуць у народзе, добрым словам. За трэці працоўны семестр 1982 года намі было асвоена 140 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

У час працоўнага семестра-83 байцы СБА імя С. П. Каралёва будуць будаваць жылыя дамы для працаўнікоў вёскі, жывёлагадоўчыя памяшканні. Гэта будзе іх непасрэдны ўдзел у рашэнні задач, пастаўленых перад савецкім народам Харчовай праграмай.

У 1985 годзе спаўняецца 150 гадоў карэла-фінскаму эпасу «Калевала». Наш атрад будзе прымаць удзел у падрыхтоўцы да гэтага свята.

Мы, байцы студэнцкага будаўнічага атрада імя С. П. Каралёва, пастараемся прыкласці ўсе намаганні, каб яшчэ больш квітнеў гэты край.

І. ЧАЦВЁРКІН,
камандзір атрада імя С. П. Каралёва.

Сход актыву

АДБЫЎСЯ СХОД актыву СБА Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, на якім разгледжана пытанне аб гатоўнасці зводнага студэнцкага атрада да трэцяга працоўнага семестра 1983 года. На сходзе прысутнічалі прадстаўнікі рэктарата, парткома, дэканы і іх намеснікі, сакратары партбюро факультэтаў.

У рабоце сходу прынялі ўдзел намеснік камандзіра рэспубліканскага штаба СБА І. Шостак, камісар абласнога штаба СБА І. Мішкарудны.

З дакладам выступіў начальнік штаба працоўных спраў універсітэта А. Астапенка. У спрэчках выступілі П. Салаў — намеснік сакратара парткома, А. Казулін — сакратар камітэта камсамола універсітэта, М. Прыгодзіч—камандзір Клецкага зональнага студэнцкага атрада, В. Малафееў — камісар інтэрнацыянальнага атрада «Мінск-83», М. Труш—намеснік дэкана ФПМ, А. Бяляк—камісар штаба працоўных спраў хімічнага факультэта, камандзір атрада «Алеся», А. Дулінец — камандзір СБА «Стэлуца», А. Балібардзін—камісар атрада «Аэліта».

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова, а таксама зацверджаны сацыялістычныя абавязацельствы зводнага студэнцкага атрада універсітэта на рабочы перыяд 1983 года.

Камісар абласнога штаба СБА І. Мішкарудны ўручыў Ганаровую грамату абкома камсамола і каштоўны падарунак рэдкалегіі газеты СБА «Славія» за першае месца ў абласным аглядзе-конкурсе насценгазет.

Ганаровымі граматамі камітэта камсамола універсітэта па выніках падрыхтоўчага перыяду ўзнагароджаны фізічны, механіка-матэматычны і юрыдычны факультэты, якія занялі адпаведна першае, другое і трэцяе месцы ў сацыялістычным спаборніцтве.

У сацыялістычным спаборніцтве паміж лінейнымі атрадамі універсітэта першае месца заняў СБА імя Дзімітрава (гістфак), на другім—будатрад «Аэліта» факультэта радыёфізікі і электронікі і трэцяе — у СБА імя Арцімовіча (фізфак). Яны таксама ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі камітэта камсамола.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

Праблемы патрэбна рашаць!

НЕ ПАСПЕЕШ азірнуцца, і для студэнтаў закончыцца экзаменацыйная сесія. Нехта з іх будзе адпачываць, нехта надзене зялёную будатрадаўскую форму і паедзе ў саставе СБА працаваць у розныя куткі краіны і рэспублікі: Пскоў і Мінскую вобласць, Малдавію і Усць-Ілім, Якуцк і Уральскую вобласць, Стаўрапаль і Цюмень... Адны будуць будаваць жылыя дамы, дзіцячыя сады і яслі, школы, адміністрацыйныя памяшканні. Другія — збіраць багаты ўраджай гародніны і садавіны. Усе яны будуць рабіць адну справу: памнажаць багацці нашай Радзімы.

Але ўсё гэта крыху наперадзе. А сёння толькі-толькі падведзены вынікі падрыхтоўчага перыяду. За гэты час камітэтам камсамола, штабамі працоўных спраў факультэтаў праведзена значная работа па фарміраванню СБА, іх падрыхтоўцы да працоўнага семестра 1983 года.

У падрыхтоўчы перыяд паміж атрадамі было разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва, якое ахапіла ўсе бакі работы. Вынікі яго падводзіліся кожны месяц. Больш за 80 працэнтаў байцоў мелі ў гэтым годзе партыйныя, камсамольскія і адміністрацыйныя даручэнні.

На высокім узроўні арганізавана работа СБА «Беларусачка» (ФПМ), «Стэлуца» (мехмат), «Алеся» (хімфак), «Мара» (філфак), імя Арцімовіча (фізфак), «Аэліта» (факультэт радыёфізікі і электронікі), імя Дзімітрава (гістфак). Гэтыя атрады актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці факультэтаў, у правядзенні суботнікаў, своечасова афармляюць атрадную дакументацыю.

Байцы лінейных атрадаў універсітэта прайшлі курс вучобы і паспяхова здалі экзамены па тэхніцы бяспекі. У маі на базе ГПТВ была праведзена прафесійная падрыхтоўка ўдзельнікаў працоўнага семестра.

Будаўнічымі атрадамі праведзена значная грамадска-палітычная работа. За падрыхтоўчы перыяд 459 лектарамі было прачытана 1.859 лекцый, дадзена 182 канцэрты, выпушчана 342 насценгазеты, аформлена 217 стэндаў, сабрана для перадачы сельскім школам звыш 5 тысяч кніг.

З кожным годам расшыраецца сфера дзейнасці студэнцкіх атрадаў. Акрамя будаўнічых і сельскагаспадарчых, БДУ фарміруе два атрады правадніковай.

Павялічылася колькасць камуністычных атрадаў. У гэтым годзе іх сфарміравана 7 (у мінулым было толькі тры). Байцы аднаго з іх працуюць ужо піянерважатымі ў лагеры «Зубронак».

Для работы ў час трэцяга працоўнага семестра сфарміравана 13 інтэратрадаў, у якіх будуць працаваць 115 замежных студэнтаў. Гэтаму папярэднічала вялікая прапагандысцкая работа. У прыватнасці, на фізічным, механіка-матэматычным, філалагічным, гістарычным факультэтах, факультэце прыкладной матэматыкі праведзены вечары працоўнай славы, на якія былі запрошаны замежныя навучэнцы. Штаб працоўных спраў універсітэта разам з інтэраддзелам правёў нараду са старшынямі замежных зямляцтваў па прапагандзе СБА.

Штабамі працоўных спраў у пачатку падрыхтоўчага перыяду праводзілася вучоба ўсіх кіраўнікоў і актывістаў СБА, дзе разглядаліся пытанні практычнага кіраўніцтва атрадамі, задачы і мерапрыемствы па падрыхтоўцы будатрадаў да працоўнага семестра.

Асноўнай формай культурна-масавай работы з'яўляюцца агітбрыгады, якія створаны ў кожным лінейным атрадзе. Па выніках універсітэцкага аглядуконкурсу першае месца заняла агітбрыгада СБА «Мара» (філфак), другое — СБА «Арбіта» (юрфак), трэцяе—СБА імя Арцімовіча (фізфак).

Аднак тут жа неабходна адзначыць, што такія факультэты, як біялагічны, геаграфічны, журналістыкі, гістарычны і радыёфізікі і электронікі, па невядомых прычынах наогул не прынялі ўдзелу ў гэтым мерапрыемстве.

Сёлета ва універсітэце сфарміравана 105 лінейных атрадаў агульнай колькасцю 3550 чалавек. Камплектаванне СБА ў асноўным завяршылася да 1 сакавіка (падкрэслім: у асноўным). Але, на жаль, у некаторых атрадах яшчэ і сёння не хапае байцоў. Асабліва складана з будатрадамі, якія застануцца працаваць у Беларусі: ім не хапае больш як 30 чалавек. Толькі на гістарычным факультэце не могуць укамплектаваць два студэнцкія атрады — «Універсітэцкі» і «Рамантык», якія выязджаюць у Пскоўскую і Мінскую вобласці. А рэзервы на гістфаку ёсць.

Тут дарэчы будзе некалькі слоў сказаць пра механіка-матэматычны факультэт. Калі параўноўваць яго з гістарычным, то атрымліваецца, што пры роўнай колькасці мужчын і пры роўнай колькасці практык на факультэтах на мехмаце едзе ў будатрад 181 чалавек, а на гістфаку — усяго 129. Штаб працоўных спраў гістфака змог укамплектаваць толькі выязныя атрады, якія могуць быць сфарміраваны і без яго ўдзелу.

Ёсць яшчэ адзін, не менш важны бок справы. Па прычыне таго, што атрады, якія будуць працаваць на будаўнічых аб'ектах Мінска, Мінскай і Віцебскай абласцей, камплектуюцца студэнтамі 1—2 курсаў,— камандзірамі назначаюцца таксама студэнты, якія не маюць ніякага вопыту работы ў СБА. Укамплектаваць такі атрад намнога складаней, чым выязны. Часткова віна ў гэтым прымаючых арганізацый, якія не могуць забяспечыць фронтам работ, будаўнічымі матэрыяламі.

І ўсё ж было б няправільным вінаваціць ва ўсім іншых. Ёсць над чым задумацца камітэтам камсамола факультэтаў, штабам працоўных спраў. Напрыклад, на факультэце радыёфізікі і элктронікі з дзесяці кіраўнікоў лінейных СБА толькі трое маюць стаж работы ў будатрадзе. А астатнія? Астатнія едуць у будаўнічы атрад упершыню. Тут нехта запярэчыць: усе ж пачыналі з «нуля». Так то яно так. Але ўсё ж, на наш погляд, студэнт павінен спачатку пабываць у СБА байцом, пазнаёміцца з усімі бакамі будатрадаўскага жыцця, а ўжо потым можа ехаць і камандзірам.

Па даных штаба працоўных спраў універсітэта за падрыхтоўчы перыяд змяніўся кожны трэці камандзір ці камісар «мясцовых» атрадаў. Таму ў арганізацыйным плане такія атрады намнога слабей за астатнія. Каб работа, што вядзецца ў падрыхтоўчы перыяд, дала найбольш плённыя вынікі, нядрэнна было б на ўсіх факультэтах замацаваць за СБА куратараў з ліку выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэтаў, якія маюць стаж работы ў СБА. У гэтым плане можна адзначыць добрае супрацоўніцтва дэканатаў, партыйных бюро юрыдычнага, фізічнага факультэтаў, а таксама ФПМ з камсамольскімі арганізацыямі.

Некалькі слоў аб колькасці фарміруемых атрадаў, якая даводзіцца кожнаму факультэту. Возьмем для прыкладу той жа факультэт прыкладной матэматыкі. Замест 9 будатрадаў (2 мужчынскіх і 5 жаночых двухмесячных і двух жаночых аднамесячных) тут сфарміравана 16 атрадаў (!). Што ж атрымліваецца? А тое, што ў атрад едуць не толькі тыя, хто вучыцца на выдатна і добра, але і троечнікі, нават двоечнікі. А СБА — гэта свайго роду заахвочванне за добрую вучобу, актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Ёсць тут і другі бок медаля: «хвасцістам» патрэбна да пачатку новага навучальнага года ліквідаваць свае запазычанасці, але ніхто зрабіць гэта раней, чым у лістападзе, не зможа — быў у будатрадзе.

Акрамя таго, байцы СБА бесперапынна ходзяць у дэканаты, каб перанесці практыку або тэрміны здачы экзаменацыйнай сесіі. Гэта выклікае дадатковыя цяжкасці як для саміх студэнтаў, так і для выкладчыкаў. Думаецца, што вышэйстаячым штабам СБА патрэбна было падумаць аб тэрмінах выезду студэнтаў у будаўнічыя атрады.

Мы ўпэўнены, што ўсе гэтыя праблемы знойдуць сваё вырашэнне.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

КАНТАКТЫ

НАШЫ ГОСЦІ — АМЕРЫКАНСКІЯ СТУДЭНТЫ

НЯДАЎНА універсітэт наведала дэлегацыя амерыканскіх студэнтаў, якія знаходзіліся ў Мінску па запрашэнню БММТ «Спадарожнік». У састаў дэлегацыі ўваходзілі студэнты каледжаў штата Мічыган. Госці азнаёміліся з музеем гісторыі Белдзяржуніверсітэта. Асаблівую цікавасць выклікалі ў іх аддзелы нумізматыкі, археалогіі, этнаграфіі Беларусі. Шмат пытанняў задалі госці па гісторыі універсітэта, структуры камсамольскай арганізацыі.

У час сустрэчы ў камітэце камсамола прысутнічалі студэнты гістфака В. Шадурскі, С. Дзяхцяр, І. Сяргеенка, В. Кернажыцкая і студэнтка мехмата А. Заграюк. Яны расказалі аб універсітэце, жыцці савецкага студэнцтва, структуры і органах студэнцкага самакіравання, ільготах, якімі карыстаюцца савецкія студэнты.

Амерыканскія студэнты расказалі, што ўсе яны вучацца ў прыватным каледжы з фізіка-матэматычным ухілам, дзе аплата за вучобу дасягае 8 тысяч долараў у год, і таму ім даводзіцца працаваць, каб заплаціць за вучобу. Нягледзячы на тое, што каледж прыватны і прэстыж яго даволі высокі, не ўсе яго выпускнікі могуць знайсці сабе работу.

У канцы сустрэчы была выказана ўпэўненасць, што такія кантакты садзейнічаюць узаемаразуменню і ўмацаванню сувязей паміж савецкімі і амерыканскімі студэнтамі, паміж нашымі народамі.

Амерыканскія і савецкія студэнты абмяняліся памятнымі сувенірамі.

А. НОВІК,
намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

СПОРТ

АД МАСАВАСЦІ — ДА МАЙСТЭРСТВА

СПОРТ

ДЗЕ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ — ТАМ ПОСПЕХ

ПАСЛЯ ЗАКАНЧЭННЯ чэмпіяната універсітэта па лёгкай атлетыцы многія старшыні спартыўных бюро факультэтаў кінуліся падлічваць вынікі XXXI спартакіяды. На працягу васьмі месяцаў працягваўся спартакіядны марафон. Вось як выглядае выніковая табліца без уліку прэміяльных ачкоў: у першай калонцы стаіць каэфіцыент факультэта, у другой — набраныя ачкі ў заліковых відах, у трэцяй — сярэдні бал.

	к	а	с. б.
1. Юрфак	16	3029	189,2
2. Мехмат	18	3114	173,0
3. ФПМ	18	2737	152,0
4. Фізфак	17	2432	143,0
5. Радыёфізікі і электронікі	13	1791	137,0
6. Гістфак	14	1727	123,4
7. Журфак	8	851	106,3
8. Хімфак	14	1460	104,3
9. Геафак	12	1195	99,6
10. Біяфак	11	822	74,7
11. Філфак	14	806	57,5

— Як і для кожнай спартакіяды, — гаворыць старшыня спартыўнага клуба універсітэта А. С. Балдзін,—для прайшоўшай характэрна масавасць. А ў масавасці — гарантыя поспеху, майстэрства. Усе спаборніцтвы былі праведзены арганізавана. У гэтым годзе тэрміны турніраў не накладваліся. Трэці раз запар першае месца заняў юрыдычны факультэт. Спартакіяду вызначала вострая барацьба. Хоць вялікіх змен у турнірнай табліцы і не адбылося, але назіралася выроўніванне спартыўных магчымасцей факультэтаў. Восем факультэтаў перамаглі ў асобных турнірах (у мінулым годзе — шэсць), усе маюць прызавыя месцы. У кожным відзе ёсць свае лідэры.

Юрыдычны факультэт (намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту У. Фралоў, старшыня спортбюро М. Байкоўскі) зноў першы. Нялёгка яму было ў гэтым годзе. На лідэра раўняюцца, усе стараюцца ў яго выйграць. Мабыць таму юрфак заняў толькі другія месцы ў класічнай і вольнай барацьбе, а такога даўно не было. Няўдалы старт — і юрысты доўга не маглі выйсці ўперад. Але потым прыйшлі поспехі і агульнакамандная перамога. Зразумела, што перамога была не выпадковай. На факультэце ўважліва адносяцца да спорту. Спартсмены не застаюцца без увагі дэканата, партыйнага бюро, камітэта камсамола і прафсаюзнага камітэта. А гэта — важны стымул для поспеху. Сем першых месц і сем другіх не могуць не парадаваць!

Значна прыбавіў механіка-матэматычны факультэт (намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту У. Мурашоў, старшыня спортбюро Ф. Палякшанаў). Выступленні мехмата характарызуюцца стабільнасцю. Самае нізкае месца было ў стральбе, дзе каманда падзялілa 6—7-я месцы. Факультэт пятнаццаць разоў уваходзіў у прызёры спаборніцтваў. Гэта больш, чым у астатніх. Каманды мехмата — самыя арганізаваныя. Тут не дзеляць віды спорту на заліковыя і другарадныя. А лёгкая атлетыка — «каралева спорту» — галоўны козыр факультэта.

Факультэт прыкладной матэматыкі (намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту А. Міхнавец) аказаўся амаль па ўсіх паказчыках на ўзроўні мінулага года. Зноў не было роўных ФПМ па шашках, настольнаму тэнісу, спартыўнаму арыенціраванню.

Фізічны факультэт 15 разоў займаў першае месца ў спартакіядах. Цяпер ён перажывае не лепшыя часы. Аснову зборнай складаюць першакурснікі. Але фізфак застаўся лідэрам універсітэта па футболу і плаванню.

Паспяховым трэба лічыць пятае месца факультэта радыёфізікі і электронікі. Адчуваецца, што спортбюро факультэта (старшыня А. Кулінка) праводзіць пэўную работу. Дружна, арганізавана выходзілі студэнты на спаборніцтвы. Гэтага якраз і не хапіла гістарычнаму факультэту.

Вялікія перамены адбыліся на факультэце журналістыкі. З адстаючых да групы мацнейшых — такі шлях прайшоў журфак. Намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту Л. Артамонава і спортбюро змаглі наладзіць спартыўную работу на факультэце. Трэба адзначыць, што журналісты маюць добры спартыўны патэнцыял. А вось хімфак і геафак не выкарысталі ўсіх магчымасцей.

У параўнанні з мінулым годам біёлагі знізіліся на адно месца. Ніжэй толькі філалагічны факультэт. Назіраецца дэфіцыт на добрых спартсменаў. Але ж змаглі хлопцы філфака прабіцца ў групы мацнейшых па валейболу і футболу. Відаць, гэтыя факультэты звыкліся з роляй адстаючых.

Найбольш масавымі з'явіліся спаборніцтвы па зімоваму і летняму мнагабор'ю ГПА, футболу, баскетболу, валейболу, лёгкай атлетыцы, лыжных гонках, вясенняму кросу, кубку першых курсаў па бегу на прыз газеты «Беларускі універсітэт».

Хочацца сказаць добрае слова ў адрас суддзяў, якія правялі спаборніцтвы на высокім узроўні. Але па-ранейшаму шмат нараканняў у адрас суддзейства па шашках, шахматах, вясенняму кросу. Слаба быў арганізаваны чэмпіянат па настольнаму тэнісу, а па фехтаванню зусім не праводзіўся.

Калі праходзіла першынство універсітэта па веласпорту — ніхто не ведаў. Спаборнічалі толькі тыя, хто займаецца ў секцыях. Аказваецца, старты праходзілі ў рамках першынства ВНУ рэспублікі, што з'яўляецца недапушчальным.

Яшчэ не ўдасканалена сістэма падліку ачкоў. За першае месца звычайна даецца 16 ачкоў, а ў веласпорце — 36. Не вырашана канкрэтна пытанне аб абмежаванні колькасці спартсменаў, выстаўляемых на від. У лёгкай атлетыцы — 34, а ў плаванні — неабмежавана.

Некаторыя спаборніцтвы ператвараліся ў чэмпіянаты секцый. Напрыклад, турніры па цяжкай атлетыцы, спартыўнай і мастацкай гімнастыцы, веласпорту. У цяжкай атлетыцы ўдзельнічала ўсяго чатыры факультэты, а ў веласпорце — толькі 16 чалавек.

На старты спартакіяды выйшлі тысячы студэнтаў. Многія з іх сталі сістэматычна займацца спортам. На спаборніцтвах выступалі вядучыя спартсмены універсітэта. А выступаць побач з імі — выдатная школа.

Спартакіяда закончылася. На факультэтах прааналізуюць яе вынікі, зробяць пэўныя вывады і ў наступным годзе зноў уключацца ў спартыўную барацьбу.

У. АБРАМОВІЧ,
член праўлення спартыўнага клуба.

САПЕРНІКАЎ ТОЛЬКІ ДВОЕ

ЗВЫЧАЙНА ў суботнія вечары на стадыёне не так мнагалюдна, як у будніх дні. Гэта зразумела: закончыўся навучальны тыдзень, многія спяшаюцца дамоў, ідуць у паходы. Але ў апошнюю суботу мая на стадыёне сабралася шмат людзей. Тут праходзіла першынство універсітэта па лёгкай атлетыцы. Удзельнічала адзінаццаць факультэтаў, а за перамогу спрачаліся толькі два, ды яшчэ тры за трэцяе месца, астатнія ж змірыліся са сваім турнірным становішчам. Таму многія выставілі няпоўныя саставы, выступалі не ва ўсіх відах праграмы.

У першы дзень спаборніцтваў адразу ж уперад вырваліся мехмат і юрфак. Дзве эстафеты 4 па 100 метраў выйграў мехмат, юрысты двойчы былі другімі. У бегу на 100 м пераможцамі сталі таксама спартсмены гэтых факультэтаў. С. Валанцэвіч (мехмат) быў першым у мужчын — 10,7 секунды, а Н. Лукашэвіч (мехмат) у дзяўчат — 12,6 секунды. 1500 метраў выйграў таксама студэнт мехмата А. Курышка з добрым вынікам — 3 мінуты 59,0 секунд. Менш чым адну секунду прайграў яму Г. Маскаленка (хімфак). Майстар спорту міжнароднага класа Т. Бойка (юрфак) без барацьбы перамагла ў скачках у вышыню. Толькі Ю. Шынкевіч (фізфак) змог абагнаць спартсменаў мехмата і юрфака на дыстанцыі 400 метраў.

Не менш цікавай атрымалася барацьба і на другі дзень спаборніцтва, які стаў шчодрым на добрыя рэзультаты. Найбольш цікавымі былі стаерская дыстанцыя на 5000 м у мужчын і «шведскія» эстафеты. З першых метраў пяцікіламетровай дыстанцыі наперад выйшаў А. Міхейкін (ФПМ). На фінішы ён і быў першым, абагнаўшы Г. Маскаленку на 20 секунд.

Перад апошнім відам — эстафетамі — становішча было амаль ясным. Лідэрам замацаваўся мехмат, на другім месцы — юрфак. І толькі за трэцяе месца ішла напружаная барацьба. Факультэт радыёфізікі і электронікі зрабіў усё магчымае, каб дагнаць ФПМ. Але радыёфізікам не хапіла ўсяго паўтара ачка.

У эстафеце 400+300+200+ +100 метраў першымі былі дзяўчаты юрфака. Адкрыццём першынства стаў студэнт першага курса хімічнага факультэта Віктар Касцяйкоў. Ён упершыню выканаў нарматывы першага разраду на дыстанцыі 1500 метраў і добра прабег першы этап у эстафеце 800+400+ 200+100 метраў і тым самым садзейнічаў перамозе свайго факультэта.

А. ДАНІЛЬЧАНКА.

УСЯГО II АЧКОЎ

НА ДНЯХ зборная каманда універсітэта вярнулася з Гомеля, дзе ўдзельнічала ў чэмпіянаце Белсавета ДСТ «Буравеснік». Вярнулася з другім агульнакамандным месцам. Спартсмены універсітэта ўступілі камандзе Брэсцкага педагагічнага інстытута ўсяго 11 ачкоў.

У ходзе чэмпіяната нямала добрых рэзультатаў было паказана нашымі лёгкаатлетамі. Парадавалі дзяўчаты. У эстафеце 4 па 400 метраў Г. Хадаркевіч, Н. Лукашэвіч, А. Люцко і М. Кнацько былі першымі. Лукашэвіч яшчэ двойчы паднімалася на п'едэстал: пасля стартаў на дыстанцыях 100 і 200 метраў, толькі ўжо на трэцюю і другую ступенькі. Двойчы дабівалася поспеху Тамара Міраноўская: трэцяе месца на дыстанцыі 400 м і другое—на 800. Ірына Панчкоўская ў спартыўнай хадзьбе на дыстанцыі 3 і 5 км стала другім прызёрам. Нялёгка прыйшлося Таццяне Баярка. Састаў забегу на 1500 м сабраўся даволі моцны. Але аб характары Тані, яе байцоўскіх якасцях гаворыць трэцяе месца.

Не падвялі і хлопцы. Чэмпіёнам стаў студэнт ФПМ А. Міхейкін. Прызёры спаборніцтваў — А. Масіна і А. Курачкін.

А. МІХАЙЛАВА.

СПОРТ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

9 чэрвеня 1983 г.

Зак. 1044. АТ 04287

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ